фабрыкі «Маланка», цяпер — мэблевая фабрыка. Да старых будынкаў можна аднесці сінагогу, якой налічваецца больш за 200 год...

*А. Бобр, М. Сузько*

### Кляштар бернардзінцаў

Вул. Камсамольская, 16. Пабудаваны ў 1-й палове XVIII ст. з цэглы. Кляштар складаецца з касцёла і прыбудаванага да яго з усходняга боку жылога корпуса.

Касцёл трохнефавы, двухвежавы. Галоўны фасад раскрапаваны пілястрамі і карнізамі. Уваход афармлены кілепадобным парталам з крывалінейным франтонам. Бакавыя фасады вылучаны рытмам кілепадобных аконных праёмаў і здвоеных пілястраў у прасценках. Вежы касцёла спачатку барочнага характару перабудаваны ў стылі класіцызму: трохвугольныя франтончыкі, арачныя праёмы ў прамавугольных нішах.

Прастора інтэр'ера падзелена 4 слупамі на 3 нефы. Цэнтральны неф перакрыты цыліндрычным скляпеннем на падпружных арках, бакавыя — крыжовымі скляпеннямі. Пяцігранная алтарная частка аддзелена іканастасам. Хоры размешчаны над уваходам. Пад алтарнай часткай знаходзіцца крыпта. Жылы корпус характэрнай галерэйнай планіроўкі: келлі маюць выхад у калідор, асветлены аконнымі праёмамі.

У тарцовай частцы вялікая квадратная ў плане трапезная, перакрытая цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі.

Кляштар — помнік архітэктуры барока.

*А. Кулагін*

### Кляштар цыстэрцыянцаў

Вул. Гогаля, 121. Пабудаваны ў 1745 г. Уключае мураваны касцёл і жылы корпус. Цяпер у жылым корпусе размешчана спартыўная база. Касцёл аднанефавы з трохграннай алтарнай часткай і высокім двухсхільным дахам. Галоўны фасад трохчасткавы, насычаны вертыкальнай крапоўкай, прарэзаны арачнымі аконнымі праёмамі, нішамі з ракавінамі і завершаны атыкавым ступенчатым шчытом. Гарызантальныя чляненні фасада падкрэслены крапаванымі карнізамі. Галоўны ўваход — праз нізкі пяцігранны тамбур, дэкарыраваны лапаткамі. Прастора інтэр'ера рэканструявана (падзелена на 2 паверхі). Прэсбітэрый вылучаны арачным праёмам, сцены крапаваны шматслойнымі карнізамі, пілястрамі, нішамі.

Жылы корпус двухпавярховы, прамавугольны ў плане. Фасады крапаваны пілястрамі. Планіроўка галерэйная з аднабаковым размяшчэннем тыпавых келляў.

Кляштар — помнік архітэктуры позняга барока.

*А. Кулагін*

## Напярэдадні буры

На пачатак 1878 г. насельніцтва Мазыра налічвала 7800 чалавек. Тут было 25 мураваных і 1082 драўляныя дамы, мелася друкарня і метэаралагічная станцыя. Два разы ў год праводзіліся кірмашы: 6 студзеня і 6 жніўня, на якіх гандлявалі ў асноўным лесам, жывёлай, збожжам, рыбай, смалой, дзёгцем, паташом, шкіпінарам і інш. Гандлёвы абарот кірмашоў складаў каля 300 тыс. рублёў. З гэтай сумы дзве трэці прыходзілася на ўвоз, адна трэць — на вываз тавараў.

У 70—80-я гады XIX ст. у Мазыры не было буйных прамысловых прадпрыемстваў, развіваліся рамесная вытворчасць і гандаль. У невялікай гарбарнай майстэрні, піваварні, на вытворчасці алею колькасць работнікаў дасягала крыху больш як 100. Прыстань пасажырскіх параходаў абслугоўвала рэйсы паміж Кіевам і Пінскам.

Яшчэ ў сярэдзіне 70-х гадоў экспедыцыя генерала І. І. Жылінскага паклала пачатак навуковым даследаванням і спробам асушэння балот беларускага Палесся. Беднасць сродкаў, якія выдзяляў урад на гэтыя мэты, не дазволіла здзейсніць намечаную праграму.

Жыхары горада і павета актыўна адгукваліся на ўсе значныя падзеі, якія адбываліся ў свеце.




Рэклама акцыянернага таварыства запалкавай фабрыкі «Маланка»

14 верасня 1876 г. у Мазыры адкрыўся дабрачынны гурток на карысць славян Балканскага паўвострава, якія змагаліся супраць турэцкага прыгнёту. Члены гуртка займаліся зборам ахвяраванняў. Яшчэ 15 кастрычніка 1875 г. мазыране сабралі і адправілі для славянскіх народаў, на адрас рэдакцыі газеты «Голас» 86 рублёў. 14 лістапада 1876 г. драматычная трупа Васіленкі, якая прыбыла ў Мазыр, дала спектакль, збор ад якога пайшоў на карысць паўстанцаў. З 10 снежня 1876 г. жыхары Мазырскага павета сабралі 910 рублёў 95 кап. для садзейнічання справе вызвалення славянскіх народаў ад турэцкай няволі.

1 сакавіка 1881 г. у Пецярбургу бомбай, якую кінуў Ігнацій Грынявіцкі — член арганізацыі «Народная воля», быў смяротна паранены Аляксандр II. Па справе «першасакавікоўцаў» разам з А. І. Жалябавым, С. П. Пяроўскай, Н. І. Кібальчычам, Т. М. Міхайлавым і Н. І. Рысаковым была асуджана і ўраджэнка Мазыра Геся Гельфман.

З сярэдзіны 90-х гадоў у Мазыры ўзнікаюць даволі буйныя прамысловыя прадпрыемствы. Першае з іх з некалькімі сотнямі рабочых адкрылася ў чэрвені 1895 г. у будынку былога жаночага каталіцкага манастыра ў прыгарадзе Кімбараўка — запалкавая фабрыка «Маланка», якая належала купцу Х. Я. Дворжацу. 7 чэрвеня 1895 г. ён звяртаўся да фабрычнага інспектара Мінскай губерні: «Имею честь уведомить Вас, что котел, который я ставлю на моей фабрике, уже подготовлен, но я не решаюсь начать кладки до его испытания. Так как времени до открытия фабрики у меня осталось очень мало, то я осмеливаюсь обратиться к вам с покорнейшей просьбой прислать человека для надлежащего испытания». Усе неабходныя фармальнасці былі выкананы, запалкавая фабрыка «Маланка» пачала выдаваць прадукцыю. На ёй працавалі 33 рабочыя і служачыя з фабрыкі «Вулкан», якія прыехалі сюды з Пінска. Рабочыя табелі закрываліся па суботах, аплата працы рабочых праводзілася штотыднёва па аўторках. Пабудовы каталіцкага манастыра былі пашыраны і абсталяваны пад баракі для рабочых.

Менш чым праз год на фабрыцы адбылася стыхійная і неарганізаваная забастоўка работніц, з якой адміністрацыі ўдалося справіцца даволі лёгка. Упраўляючы фабрыкі «Маланка» С. Г. Розенблюм 19 красавіка 1896 г. дакладваў начальству: «...В декабре 1895 г. мною было выдвинуто объявление фабриканта о том, что с января 1896 г. плата за 1000 ручных гильз будет понижена с 10 коп. до 8, а за 1000 чимберов с 15 до 12 коп. Этим объявлением несогласные на новые цены приглашались заявить о своем несогласии в конторе фабрики продолжать работу. Никто с заявлением не явился. Вследствие того, что в декабре сгорело здание, в котором производилась ручная выделка коробочек, пришлось нанять на работу много новых работниц, и понижение расценок было приостановлено до более благоприятного времени. В начале апреля хозяин все-таки объявил о снижении цен.

16 апреля надзиратель донес, что работница Малка Шехтман уверяла других работниц, что в гильзах чувствуется большой недостаток, и если действовать дружно, то можно заставить хозяина

Паром цераз Прыпяць. 1907



Вул. Калінік. 1905. Цяпер вул. Калініна



оставить старые расценки. 18 апреля М. Шехтман и еще 25 работниц не вышли на работу, они собрались у квартиры Шифры Герштейн. Выступали Шифра Герштейн и Малка Одлина...»

Праз тры дні былі звольнены тры работніцы — зачыншчыцы бунту. Астатнія вымушаны былі вярнуцца да работы, згадзіўшыся на ўмовы, прадыктаваныя ўладальнікам фабрыкі. У наступныя гады паніжэнне расцэнак праводзілася не раз: цэны на прадукцыю залежалі ад рынку, увесь час вагаліся, што істотна ўплывала на аплату працы рабочых. У аб'яве па заводу 6 ліпеня 1897 г. указвалася: «Настоящим доводится до сведения работающим, что с 1 августа 1897 г. за упаковку 1000 коробок спичек плата назначается 12 коп. Работницы, желающие получить расчет с 1 августа, должны заявить об этом в контору фабрики не позже 15 сего июля».

На фабрыцы часта здараліся пажары — у снежні 1896 г., у студзені 1899 г., кастрычніку 1904 г., студзені 1907 г., маі 1909 г., лютым 1915 г. З 1898 г. прадпрыемства перайшло ва




Вул. Слуцкая. 1907. Цяпер вул. Ленінская




Набярэжная. 1911

уласнасць акцыянернага таварыства «Маланка», асноўны капітал якога склаў 300 тысяч рублёў. Членамі праўлення таварыства сталі Е. Гальперын і Х. Дворжац. Тады ж з мэтаю барацьбы з канкурэнтамі ўладальнікі запалкавых фабрык Мінскай губерні (г. Барысаў — «Вікторыя», г. Мазыр — «Маланка», г. Пінск — «Прагрэс», г. Койданава — «Дружына») аб'ядналіся ў сіндыкат. У «Табель взысканий» фабрыкі «Маланка», якія быў зацверджаны старшым інспектарам Фільгаберам 26 студзеня 1898 г., былі ўнесены наступныя пункты.

*За нарушение порядка.*

1. За приход на работу позднее назначенного времени — до 30 коп.
2. За нарушение тишины криком, бранью и дракою — до 25 коп.
3. За неповиновение старшим — до 50 коп.
4. За оскорбление старших — до 1 руб.
5. За несоблюдение чистоты и опрятности — до 10 коп.
6. За курение табаку в месте, где запрещено, и за неосторожное обращение с огнем — до 1 руб.

| | | |
|---|---|---|
| 7. | За несоблюдение правил предосторожности при работе с машинами и механизмами | до 50 коп. |
| 8. | За неразрешенную отлучку от работы | до 50 коп. |
| 9. | За появление на фабрику в нетрезвом виде | до 25 коп. |
| 10. | За устройство недозволенных игр на деньги | до 25 коп. |
| 11. | За утрату расчетной книжки или ее порчу | до 25 коп. |
| 12. | За нарушение правил внутреннего распорядка, упомянутых в предыдущих статьях | до 10 коп. |
| 13. | За приведение посторонних лиц | до 30 коп. |

*За прогулы.*

| | | |
|---|---|---|
| 1. | За неявку на работу в течение полудня | до полудневного заработка |
| 2. | За прогул одного дня | до однодневного заработка |
| ...5. | За каждый прогульный день сдельного рабочего | 1 руб. |

Рабочие, не явившиеся на работу более трех дней без уважительных причин, сразу увольняются от службы.

*За неисправную работу.*

| | | |
|---|---|---|
| 1. | За неисправное лупление коробочной ленты | до 25 коп. |
| 2. | За небрежно насыпанную раму соломки | до 20 коп. |
| 3. | За недоброкачественное макание рам в парафин или зажигательную массу | до 10 коп. |
| 4. | За порожний ход машин вследствие недосмотра или лени рабочего | до 15 коп. |

Дзённы заробак кваліфікаванага рабочага складаў ад 75 кап. да 1 руб. 20 кап. Санітарныя ўмовы работы на фабрыцы былі дрэнныя. Вось што гаварылася ў рапарце лекарскаму аддзяленню Мінскага губернскага фабрычнага кіраўніцтва ад 25 жніўня 1899 г.: «...На фабрике «Молния» найдены такие антисанитарные условия, которые означенной Управой не предусмотрены:

1) Крайне скудное дневное освещение, зависящее от грязного содержания окон в мастерской;
2) Полное отсутствие больницы и приемного покоя при крайне неудовлетворительном состоянии аптеки (аптека помещается в маленьком шкапчике, заваленном ящиками в коридоре фабрики, в аптечном шкафу битая посуда, грязь; единственный прибор грязный, покрытый толстым слоем ржавчины; в шкафу содержатся съестные припасы слесаря).

Рабочих на фабрике 365...»

Нягледзячы на шкодныя ўмовы вытворчасці, на «Маланцы» шырока выкарыстоўвалася жаночая і дзіцячая праца, якая была больш таннай. З рабочымі, якія атрымалі траўму на вытворчасці, гаспадары не цырымоніліся. Іосіфу Дашкевічу, які атрымаў траўму вока (абпаліла твар парай з катла), было адмоўлена ў рабоце і ў пенсіі. Такія ж парадкі і правілы былі і на іншых прадпрыемствах.

У 1902 г. у Мазыры была адкрыта фанерная фабрыка «Прыма». Піваварны завод, які належаў купцу другой гільдыі Павіцкаму, упамінаецца пад 1896 г. У 1904 г. мазырскія півавары атрымалі на Усерасійскай выставе залаты медаль за мядовае піва, яны пастаўлялі свой напітак да стала імператара Мікалая II.

З 1900 па 1914 год у Мазыры і Мазырскім павеце было адкрыта звыш сямідзесяці вялікіх і малых прадпрыемстваў, сярод іх: мылаварны завод, завод па вырабе свечак Я. Абрамава на хутары Целяпуны (27 чэрвеня 1900 г.), папяровая фабрыка гандлёвага дома «Моўша Левін і наследнікі» ў Мазыры (чэрвень 1900 г.), вінакурны завод А. Снядзецкай у вёсцы Слабада (лістапад 1900 г.), мылаварны завод з салатопняй А. Ронькіна каля Мазыра (5 снежня 1900 г.), паравы млын Б. Левіна на хутары Целяпуны (9 чэрвеня 1901 г.), паравы лесапільны завод З. Трафімовіча каля вёскі Лучажэвічы (2 сакавіка 1901 г.), паравая фанерная фабрыка М. Бернштэйна, А. Аляксандрава, А. Шыфа і Ш. Ельніка ў Мазыры (26 сакавіка 1902 г.), цагельны завод Ф. Агаркава ў маёнтку Лешня (1905 г.), вінакурны завод К. Лянкевіча ў вёсцы Міхалкі (31 снежня 1908 г.), паравы лесапільны завод Бермана ў мястэчку Скрыгалаў (9 студзеня 1910 г.), млын Жалезняка і Лінштэйна ва ўрочышчы Кімбараўка (4 чэрвеня 1913 г.), млын і лесапільны завод Крыніцкага ў Мазыры (20 снежня 1913 г.).

Амаль уся вытворчасць спецыялізавалася галоўным чынам на апрацоўцы



Вул. Кіеўская. 1910. Цяпер вул. Савецкая



Базарная плошча. 1912

драўніны ці размоле зерня. Колькасць рабочых на іх была невялікая, ад 2 да 15 чалавек, выключэнне складалі фабрыкі «Маланка» — да 600 рабочых, «Прыма» — да 300 рабочых, лесапільны завод Лаўтэрбаха — звыш 50 рабочых і некаторыя іншыя.

На рубяжы XIX і XX стст. у Мазыры дзейнічала адна з найбольш позніх народніцкіх арганізацый «Трудовая воля» — паслядоўніца расійскага «Черного передела». Адзін з яе арганізатараў і актыўных удзельнікаў Е. С. Канзяр успамінае: «У жніўні 1899 г. на кватэры Максімава адбыўся злёт членаў «Трудовой воли». Сабраліся 42 дэлегаты, якія прынялі праграму нелегальнай дзейнасці палескай «Трудовой воли». Злёт працягваўся пяць дзён. Удзельнікі яго начавалі на розных кватэрах і рэкамендаваліся гаспадарам як «передвижники». Сярод дэлегатаў — прадстаўнікі вучняў і інтэлігенцыі (25 чалавек), рабочыя і сяляне (13), старэйшыя нарадавольцы (4). Заснавальнікамі арганізацыі былі Лютэровіч, Лабада, Ціхановіч і Васількоўскі.

На ўстаноўчым злёце заслуханы даклады: «Аб значэнні Палесся ў рэвалюцыйным руху», «Аб арганізацыйнай структуры намячаемай арганізацыі», «Аб правах і абавязках членаў арганізацыі», «Аб геаграфічнай карце Палесся».

На сходзе былі абмеркаваны і прыняты падрыхтаваныя загадзя дакументы, але з-за спрэчак работа заняла многа часу. Галоўнай задачай арганізацыі ставілася барацьба з самадзяржаўем і «существующим строем», скліканне ўстаноўчага сходу, стварэнне Расійскай дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі. «Трудовая воля» разглядалася як штаб арганізацыі і кіраўнік палітыка-асветніцкай работы для ажыццяўлення гэтых задач. Арганізацыя не прадугледжвала паўстання, але прызнавала забастоўкі (неповиновения), масавыя пратэсты, дэманстрацыі і нават захоп улады валаснога праўлення суда, начальніка павета, калі «это осуществит народ организованно и деловито...». Была прынята тэматыка (пералік пытанняў), па якой намячалася весці асветніцкую работу:

1. Розніца паміж грамадствам і дзяржавай. Супрацьлегласць грамадства дзяржаве.

2. Дзяржава дэспатычная, канстытуцыйная і рэспубліканская. Розніца паміж самадзяржаўем і рэспублікай, якая павінна змяніць расійскую дэспатыю.

3. Мірнае развіццё існуючых грамадстваў і дзяржаў, рэвалюцыйная змена апошніх.

4. Прапаганда будучай у Расіі рэвалюцыі і ідэі ўсенароднага ўстаноўчага сходу.

Апрача сацыяльнай, мазырскім з'ездам распрацавана была і краязнаўчая тэматыка: нарадавольцы лічылі, што яны павінны ведаць край лепш, чым кіраўнікі ўлады і даследчыкі-адзіночкі.

Брыгада нарадавольцаў спынялася ў вёсцы ці ў мястэчку — у хаце, пра якую было вядома, што ў ёй добра сустракаюць гасцей, заходзіла звычайна да настаўніка. Заставалася на 5—10 дзён, іншы раз даўжэй. Сяляне з радасцю сустракалі нарадавольцаў-асветнікаў, заступнікаў, добразычліўцаў. Яны бясплатна атрымлівалі ў сялян прытулак, ежу, транспарт, вопратку. Калі патрэбна была ахова і праваднікі, мясцовая інтэлігенцыя (настаўнікі, лесаводы, аграномы, фельчары, свяшчэннікі) садзейнічала падзвіжнікам, асабліва краязнаўцам.

Актывістамі арганізацыі цікавіліся паліцыя і жандармерыя. Многія былі арыштаваны і пакараны ў адміністрацыйным парадку да высылкі. Існавала гэтая арганізацыя 30 месяцаў (з жніўня 1899 г. па люты 1902 г.).

На пачатку XX ст. у Мазыры жыло 12 300 чалавек; асноўныя саслоўі — 9890 мяшчан, 885 сялян, 315 купцоў, 250 дваран. У горадзе налічвалася 1210 жылых пабудоў, у тым ліку 102 цагляных, 1015 драўляных. Горад асвятляўся 50 газавымі ліхтарамі. Мелася 24 карчмы, 8 піўных.

Гэты час праходзіў пад знакам актыўнага сацыяльнага супрацьборства, прычынамі якога былі аб'ектыўныя працэсы, што пачалі развівацца ў грамадстве з узнікненнем капіталістычных адносін. З'явіліся розныя яўныя і тайныя палітычныя партыі: эсэры, сацыял-дэмакраты, Бунд, анархісты, розныя групоўкі нацыяналістычнага характару. Адной з самых актыўных рэвалюцыйных арганізацый на Мазыршчыне была сацыял-дэмакратычная партыя. Гарадская сацыял-дэмакратычная арганізацыя была створана ў 1898 г., а 26 кастрычніка 1902 г. у Мазыры арганізаваўся гарадскі камітэт РСДРП.

Ноччу 17 кастрычніка 1903 г. сацыял-дэмакратамі былі раскіданы лістоўкі «К рабочим спичечной фабрики «Молния», якія заканчваліся словамі: «Знайте, что только объединение составляет силу рабочих». 24 кастрычніка з'явіліся лістоўкі «Ко всем рабочим Мозыря!», у якіх тлумачылася палітычная платформа сацыял-дэмакратыі. 18 лістапада распаўсюджаны лістоўкі «Ко всем рабочим мозырской спичечной фабрики «Молния» з заклікам выступіць супраць крывапіўцаў-фабрыкантаў. Пад уплывам агітацыі рабочыя правялі дзве забастоўкі — у лістападзе 1903 г. (180 чалавек) з патрабаваннем павялічыць заработную плату і ў студзені 1904 г. (каля 200 чалавек). За катаржную работу яны атрымлівалі мізэрную плату: мужчыны — 6 рублёў, жанчыны — 4 рублі ў месяц пры 15-гадзінным рабочым дні. Восенню 1904 г. у горадзе адбылася стачка — упершыню пад палітычнымі лозунгамі з пратэстам супраць расстрэлу 12 верасня ў Беластоку мітынгу польскіх рабочых. У выступленні прымала ўдзел звыш 600 чалавек.

На працягу 1905 г. памочнік начальніка Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення ротмістр Нартаў пасылаў з Мазыра ў дэпартамент паліцыі трывожныя тэлеграмы, якія паведамлялі аб нарастанні барацьбы ў горадзе і павеце. 25 студзеня ён данасіў: «В Мозыре с 21 сего января началась забастовка фабричных рабочих. Забастовка является результатом подстрекательства неблагонадежных лиц. За лицами этими установлено наблюдение, забастовка проходит тихо...» З 20 лютага фабрыка «Маланка» была закрыта на няпэўны час. У сакавіку 1905 г. у даносах паліцыі з'яўляюцца звесткі, што рабочыя маюць зброю. «11 сего марта около $8^1/_2$ часов вечера рабочие мозырской спичечной фабрики в числе около 300 человек начали стрелять и кричать «Ура!», «Долой самодержавие!».

11 мая мінскі губернатар Пушкін паведамляў у дэпартамент паліцыі, што на фабрыцы «Маланка» зноў пачалася забастоўка, у час якой з'явіліся новыя палітычныя лозунгі: «Долой самодержавие!», «Долой полицию!» 1 мая ў Мазыры прайшла дэманстрацыя рабочых, якія ў гэты дзень не працавалі. Вось што ўспамінаў аб гэтых падзеях іх удзельнік, рабочы фабрыкі «Маланка» С. Я. Зінгерман: «Городской комитет послал меня в Гомель, где я научился делать «макендончики» (бомбы). Летом 1905 г. я участвовал в вооруженном столкновении с несколькими сотнями казаков во главе с рогачевским исправником Хлебниковым, прибывшим с целью отвоевать в Гомеле «революционную биржу» — Кузнецкую улицу. По возвращении из Гомеля у нас была организована «лаборатория» и налажено производство бомб. Одновременно организовали и боевой отряд...»

Падзеі зацягвалі ў свой вадаварот і вучняў. 21 чэрвеня наглядчык Віленскай навучальнай акругі тэлеграфаваў міністру асветы аб спыненні заняткаў з 18 чэрвеня ў Мазырскай прагімназіі і ператварэнні яе будынка ў арэну рэвалюцыйных мітынгаў. 8 чэрвеня, як данасіў мінскі губернатар у дэпартамент паліцыі, група моладзі каля 500 чалавек — членаў сацыял-дэмакратычнай арганізацыі, пачалі дэманстрацыю пад лозунгамі «Долой самодержавие!», «Да здравствует свобода!». Стачкі і дэманстрацыі працягваліся і ў наступныя дні.

Летам 1905 г. адбыўся шэраг выступленняў сялян Мазырскага павета. У чэрвені пачалася забастоўка звыш 200 батракоў у вёсцы Дудзічы. Хваляванні адбыліся і ў вёсках Міхалкі, Прудок і іншых.

Рэвалюцыйныя падзеі ў Мазыры дасягнулі кульмінацыі восенню 1905 г. 17 кастрычніка на агульнагарадскім мітынгу быў выбраны рэвалюцыйны камітэт. Старшыня аб'яднанага стачачнага камітэта Г. Круцікаў закончыў прамову на мітынгу словамі: «Трон Мікалая-Паследка дажывае апошнія дні і хутка рухне!» 18 кастрычніка па закліку стачачнага камітэта рабочыя мазырскіх прадпрыемстваў пачалі ўсеагульную забастоўку. У тэлеграме міністру юстыцыі пракурор Мінскага акружнога суда Бібікаў паведамляў:

«В Мозыре толпа молодежи закрыла лавки, устроила во дворе прогимназии митинг. Губернатором двинуты войска. Полагаю, что, как и во всех городах губернии, забастовка пройдет без особого беспорядка». Але спадзяванні пракурора не спраўдзіліся. Дэманстрацыі і мітынгі, якія праходзілі ўжо пад палітычнымі лозунгамі, перараслі ва ўзброеную сутычку баявой рабочай дружыны з паліцыяй і войскамі. Рабочыя спрабавалі захапіць склад са зброяй, казну, вызваліць з турмы палітычных вязняў. З абодвух бакоў былі забітыя і параненыя. 20 кастрычніка мін-

скі губернатар тэлеграфаваў у дэпартамент паліцыі: «В Мозырском уезде при подавлении беспорядков ранен тремя пулями помощник исправника Анисимов; толпа громит город, сделана попытка нападения на склады. Находящийся на месте ротмистр Нартов с 10 конвойными отстаивает склады, казначейство, тюрьму; положение отчаянное, Мозырь отрезан от железнодорожного сообщения. Возможные меры передвижения войск приняты...»

На працягу 9 дзён на вуліцах Мазыра не сціхала перастрэлка. Яшчэ 18 кастрычніка была створана так званая «Мазырская рэспубліка», органам улады якой з'яўляўся рэвалюцыйны камітэт, які апіраўся на ўзброеную рабочую дружыну. Гэта быў першы ў Мазыры парастак дэмакратычнай улады, кволы і недаўгавечны. 26 кастрычніка арыштаваны ўсе члены рэвалюцыйнага камітэта, і «рэспубліка» перастала існаваць. Па прыгаворы выязной сесіі Віленскай судовай палаты 10 сакавіка 1908 г. па справе «Мазырскай рэспублікі» сем чалавек былі прыгавораны да катаржных работ — Круцікаў да 6 гадоў, Бягун, Гарэлік, Пярцоўскі, Дуброўскі, Меланіч і Зінгерман — да 4.

Пасля кастрычніцкіх падзей 1905 г. рэвалюцыйны рух на Мазыршчыне пачынае спадаць. Гэта не азначала адмовы ад барацьбы, у 1906—1907 гг. рух дасягнуў былога размаху. У снежні 1905 г. рабочыя мазырскага аддзялення Палескай чыгункі правялі забастоўку ў знак салідарнасці з пралетарыятам Масквы. Працягваў сваю дзейнасць і Мазырскі камітэт РСДРП, які не ўдалося знішчыць жандарам. У сакавіку 1906 г. у горадзе былі распаўсюджаны падпісаныя ім лістоўкі.

Выбары ў 1-ю Дзяржаўную думу, якія праводзіліся вясной 1906 г., рабочыя мазырскіх прадпрыемстваў не падтрымалі. Загадчык фабрыкі «Прыма» паведамляў старшаму фабрычнаму інспектару Мінскай губерні: «Имею честь довести, что рабочие заведываемой фабрики вчера, 5 марта, не пожелали произвести выборы уполномоченного депутата по Государственной думе, и выборы поэтому не состоялись». Аб гэтым паведамляў і ўпраўляючы фабрыкі «Маланка»: «Согласно вашему циркулярному распоряжению от 25 февраля с. г. за № 1 все объявления мною вывешены и лично всем рабочим разъяснены. Помещение для производства выборов отведено в паковочном отделении, но никто из рабочих не явился туда в назначенное время, и уполномоченного не выбрали».

Новы ўздым сацыяльнай актыўнасці 1906 г. прыйшоўся на першамайскія дні, калі прайшлі забастоўкі не толькі з эканамічнымі, але і палітычнымі патрабаваннямі. Прадпрымальнікі вымушаны былі ісці на ўступкі забастоўшчыкам. На фабрыцы «Маланка» яны дабіліся не толькі скарачэння рабочага дня на 1 гадзіну, павелічэння заработнай платы на 15 працэнтаў, але і прызнання 1 Мая святам працоўных. Чэрвеньская забастоўка 1906 г. вымусіла ўладальнікаў фабрыкі павысіць заработную плату яшчэ на 5—10 працэнтаў. 24 снежня 1906 г. адміністрацыя «Маланкі» аб'явіла аб закрыцці прадпрыемства, матывуючы гэта недысцыплінаванасцю рабочых. Гаспадары помсцілі за знявагу, якую яны перажылі ў 1905—1906 гг. У знак пратэсту супраць незаконных дзеянняў рабочыя адмовіліся атрымліваць канчатковы разлік. Яны галадалі, у сем'ях была нястача, але людзі не здаваліся. Забастоўшчыкі аднавілі работу 10 студзеня 1907 г., калі кіраўніцтва задаволіла асноўныя патрабаванні рабочых.

Але праз два дні старшаму фабрычнаму інспектару Мінскай губерні была адпраўлена тэлеграма ўпраўляючага Ш. Ельніка з паведамленнем, што фабрыка «Маланка» згарэла. Магчыма, гэта быў невыпадковы пажар. Аднаўленчыя работы вяліся марудна, вытворчасць аднавілася толькі ў верасні 1907 г.

24 мая 1907 г. пачалася забастоўка рабочых фабрыкі «Прыма». На пісьмовых патрабаваннях рабочых аб павелічэнні заработнай платы стаяла пячатка Мазырскага сацыял-дэмакратычнага камітэта. Адміністрацыя адмовілася задаволіць іх, рабочыя зноў пачалі за-

бастоўку. 7 чэрвеня паліцыя выявіла каля фабрыкі 12 снарадаў, пачаліся арышты. Частка рабочых, якія прымалі ўдзел у забастоўцы, была звольнена, на іх месцы былі набраны новыя. Гэтая забастоўка была апошнім значным выступленнем пралетарыяту Мазыра ў час падзей 1905–1907 гг. Яна праходзіла ва ўмовах спаду палітычнай актыўнасці і поспеху не мела. На фабрыцы «Прыма» адбыліся пэўныя змены. Былі ўстаноўлены новыя правілы ўнутранага распарадку: работа пачыналася ў 6 гадзін раніцы, заканчвалася ў 7 гадзін вечара з перапынкам з 8 да 8.30 і з 12 да 1 гадзіны дня; качагары пры паравых катлах і машыністы пры паравых машынах працавалі з 5 гадзін раніцы да 7 гадзін вечара; непаўналетнія (12–15 гадоў) пачыналі працу ў 8 гадзін, заканчвалі ў 5 гадзін з тымі ж перапынкамі.

Напярэдадні першай сусветнай вайны ў эканоміцы Расійскай імперыі адбываўся пэўны ўздым. Газета «Правда» 6 ліпеня 1912 г. пісала: «Город Мозырь. Этот уездный городок с 12 000 населением находится в Минской губернии. Рабочая жизнь этого города ужасная. Портные, сапожники и другие ремесленники работают и днем и вечером. Особенного внимания заслуживает находящаяся там известная спичечная фабрика «Молния». Рабочих на этой фабрике около 500, большинство из коих семейные. Работают 12 часов в день. Обращение грубое. Хороший рабочий зарабатывает максимум 60–75 коп. в день и на эти деньги должен прожить с семьей».

На жыццё рабочых Мазыра газета звяртала ўвагу і пазней. «Тяжело живется кузнецам. Самый лучший мастер в кузнице зарабатывает 80 коп. – 1 руб. в день. Это предел, дальше которого самый лучший мастер не продвигается в кузницах. Есть в кузницах так называемые молотобойцы – юноши 15–17 лет. Положение их очень печальное. Зарабатывают они 3–7 руб. в месяц на своих харчах. Работают в тесных кузнях при сильной жаре и сквозном ветре, от которого часто простуживаются. Установленного времени для кузнецов нет. Они работают по 13–15 часов в сутки. За сверхурочные работы ничего не получают. Работают поденно. Многие больны легочными болезнями...» («Правда», 12 ліпеня 1912 г.)

З 23 мая па 13 чэрвеня 1913 г. працягвалася забастоўка работніц упаковачнага аддзела фабрыкі «Маланка». Добрай арганізацыяй вызначалася забастоўка на фанернай фабрыцы «Прыма», якая закончылася поўнай перамогай рабочых. У студзені 1914 г. зноў паўсталі рабочыя фабрыкі «Маланка». У Барбарове, Сідзельніках, Мялешкавічах, Міхалках, Вялікім Бокаве расло хваляванне сялян.

Гадавая валавая прадукцыя мазырскіх прадпрыемстваў у 1914 г. складала 1 390 400 руб. Перад пачаткам вайны фабрыка «Маланка» ўваходзіла ў склад агульнарасійскага запалкавага сіндыката. У горадзе было таксама каля двух дзесяткаў рамесных майстэрняў, дзе працавала некалькі сотняў рамеснікаў. Астатняе насельніцтва займалася галоўным чынам гандлем, саматужным промыслам, а на бліжэйшых хутарах – земляробствам. У «Обзоре Минской губернии» за 1913 г. ёсць наступныя звесткі:

> «В Мозыре ярмарок – 1, приблизительная сумма привезенных товаров – 5 тыс. 450 руб., проданных – 5250 руб. По реке Припяти Мозырской судоходной дистанции грузилось 1197 пароходов, 1206 судов, 867 плотов на сумму 8 023 164 руб. На ремонт каменной тюрьмы отпущено 380 руб. По дороге Мозырь – Овруч выстроены 10 новых и 14 мостов отремонтировано. Убыток от пожара по г. Мозырю – 3900 руб., по уезду – 325 666 руб. На содержание пожарной части ушло в Мозыре 2113 руб. 65 коп. Аптек в Мозыре – 1. Имеется общество изящных искусств, любителей парусного спорта.
>
> Еврейская богодельня в Мозыре содержится на суммы коробочного сбора, членские взносы и случайные поступления. Из этих сумм на содержание израсходовано 2637 руб. 18 коп. К 1.01.1913 г. в богодельне призреваемых было 15 человек, поступило в 1913 г. 37 человек, выбыло 23, умерло – 8. Мозырское общество пособия бедным христианам к 1.01.1913 г. имело 657 руб. 34 коп. ...»

У жніўні 1914 г. пачалася сусветная вайна, якая прынесла новыя пакуты насельніцтву, падрыхтавала ўмовы для далейшых рэвалюцыйных падзей. Сялянства імкнулася да ўладання зямлёй, якая, як і раней, была ў руках памешчыкаў. З 1466 тыс. дзесяцін усёй плошчы павета 67,9 працэнтаў (995 тыс. дзесяцін) належала памешчыкам, 11,7 працэнтаў — дзяржаве і царкве. І толькі 20 працэнтаў — сялянам. На тэрыторыі павета было 147 буйных землеўладальнікаў, 50 з якіх валодала больш як 700 тыс. дзесяцін зямлі. Княгіня Гогенлое мела 220 тыс. дзесяцін, граф Тышкевіч — 74 062, браты Лаўтэрбахі — 219 585 дзесяцін, памешчык Кяневіч — 35 тысяч, графіня К. Ігнацьева (Мялешкавічы) — 28 567, А. Горват (Барбароў) — 18 тысяч, К. Снядзецкі (Слабада) — 5404, В. Лянкевіч (Прудок і Хамічкі) — 3006 дзесяцін.

На тэрыторыі сучаснага Мазырскага раёна знаходзіліся маёнткі: Асавец, Антонаўка, Барбароў, Бярозаўка, Каменка, Касцюковічы, Кімбараўка, Лешня (Лясная), Вялікі Бокаў, Малы Бокаў, Малыя Зімовішчы, Махнавічы, Міхалкі, Міцькі, Мялешкавічы, Прудок, Пянькі, Скрыгалаў, Слабада, Сідзельнікі, Стрэльск, Слабодка, Рудня Міхалкаўская, Рудня Каменская, Хамічкі.

На 19 тысяч сялянскіх двароў на Мазыршчыне было ўсяго 239 764 дзесяціны зямлі, 1712 двароў не мелі яе зусім. Больш як трэць сялян не мелі коней. Газета «Минское слова» пісала: «Бедность в Полесье страшная. Она бьет на каждом шагу, лезет в глаза отовсюду. От нее не скроешься ни в поле, ни в лесу, ни в хате, ни на скотном дворе. Леса вырублены, поля голы, амбары пусты с самой осени. На скот смотреть страшно...»

У «Географии Российской империи», выдадзенай у 1912 г., апісвалася жыллё палешукоў: «Селения у белорусов небольшие, 5—6 домов, иногда больше, избы в большинстве курные, покрытые соломой или болотным чаротом. Внутри жилье бедное, пол глиняный, окна маленькие... Еда белорусов очень постная, в подавляющем большинстве она состоит из хлеба с отрубями, картофеля и других овощей...»

У першыя дні вайны, выкарыстоўваючы мабілізацыю ў армію, навабранцы Мазырскага павета разграмілі восем маёнткаў, вінныя лаўкі, нападалі на панскіх леснікоў. Хваляванні, пачынаючы з 20 чэрвеня, адбыліся ў маёнтках Буда-Сафіеўка (памешчыка Маркварта), Міхалкі (памешчыка Лянкевіча), у маёнтках Вялікі Бокаў, Прудок, Барбароў і іншых. У рапарце мінскаму губернатару 29 ліпеня 1914 г. мазырскі павятовы спраўнік адзначаў, што ініцыятарам сялянскіх выступленняў з'явіліся запасныя, якія ўдзельнічалі ў руска-японскай вайне. У ліпені было каля 20 такіх выступленняў. Многія ўдзельнікі іх былі арыштаваны, 60 чалавек па загаду мінскага губернатара асуджаны ваенна-палявым судом. 18 лістапада 1914 г. Мінскім ваенна-акружным судом прысуджаны да смяротнай кары праз павешанне 13 сялян, абвінавачаных у разбойным нападзенні на маёнтак Вялікі Бокаў памешчыцы Бржэзоўскай (цяпер вёска Вялікі Бокаў Каменкаўскага сельсавета). Прысуд быў зацверджаны генерал-ад'ютантам Івановым толькі ў адносінах да Мікалая Каханевіча, Патрыкія Скакаўца і Аляксандра Ахрамчука, астатнія асуджаны да катаргі на розныя тэрміны. Ноччу 18 снежня 1914 г. прыгавор быў прыведзены ў выкананне.

Сяляне самавольна секлі лес, які належаў памешчыкам, палілі маёнткі, захоплівалі маёмасць памешчыкаў і казну. У маі 1915 г. мазырскі павятовы прадвадзіцель дваранства паведамляў мінскаму губернатару: «... У крестьян составилось определенное и глубокое убеждение, что поскольку их отцы, мужья, сыновья и братья призваны на войну, то остальные члены семьи должны бесплатно и безнаказанно пользоваться помещичьим сеном и дровами».

Многія мазырскія прамысловыя прадпрыемствы выконвалі ваенныя заказы. На фабрыцы «Прыма», дзе працавала 210 чалавек, выраблялі скрынкі для снарадаў. Харчовыя прадпрыемствы таксама працавалі на абарону Айчыны. На запалкавай фабрыцы 15 лютага 1915 г. адбыўся пажар, значная частка вытворчых магутнасцей выйшла са строю. У гады вайны на Прыпяці пабудаваны драўляны разводны мост, які замяніў паромную пераправу, пракладзена чыгунка Калінкавічы — Корасцень і пабудаваны чыгуначны мост. Пачалося будаўніцтва Мазырска-скрыгалаўскага тракту і бальшака Мазыр — Лельчыцы.

Нягледзячы на суровы час, працоўныя горада працягвалі барацьбу за свае правы. У ліпені 1915 г. пачалася забастоўка на фанернай фабрыцы «Прыма», накіраваная супраць рашэння яе ўладальнікаў панізіць на 30 працэнтаў і без таго малыя расцэнкі рабочым. Забастоўшчыкі дабіліся значных уступак з боку адміністрацыі.

Фронт набліжаўся да Мазыра. У 1916 г. тэрыторыя Мазырскага павета стала тылам 3-й рускай арміі, якая трымала абарону пад Баранавічамі і Пінскам.

*А. Бобр*

## Жанчына з легенды

**Краўчынскі Сяргей Міхайлавіч** (псеўданім — С. Сцяпняк) — рускі рэвалюцыянер-народнік, пісьменнік. Быў членам рэвалюцыйнай групы «Зямля і воля». Многія гады жыў за рубяжом, дзе напісаў і выдаў многа кніг аб Расіі, галоўным чынам аб рускіх рэвалюцыянерах, — «Падпольная Расія», «Расія пад уладай цароў», раман «Андрэй Кожухаў» і інш.

Сябраваў з Ф. Энгельсам, Г. В. Пляханавым, Б. Шоў, Э. Войніч. Кнігі Краўчынскага садзейнічалі выхаванню некалькіх пакаленняў рускіх рэвалюцыянераў.

Памёр у 1895 г. у Лондане.

### З успамінаў С. М. Сцепняка-Краўчынскага пра рэвалюцыянерку-народніцу Гесю Гельфман

...Я не знал ее лично. Но если в данном случае я отступаю от своего правила — говорить только о личных знакомствах, то побуждает меня к этому не слава, которую приобрело ее имя, а нравственная высота ее личности. Простая, глубоко симпатичная фигура Геси, быть может, лучше характеризует описываемую партию, чем иные блестящие типы, поражающие силой, энергией и разнообразием деятельности. Так скромный полевой цветок часто дает более верное понятие о флоре местности, чем какое-нибудь удивительное и редкое растение.

Геся Гельфман принадлежала к фанатической еврейской семье... Затронутая новыми идеями и не будучи в силах далее терпеть тяжесть семейного ига, Геся бежала из дома родных, унося оттуда как единственное наследие проклятие родителей, которые предпочли бы скорее видеть свою дочь в могиле, чем братающейся с «гойями» (отец Г. М. Гельфман занимался торговлей, мать — домохозяйка, старшая сестра матери помогала по дому. Жила семья Гельфман в районе центральной площади Мозыря, у подножья холма).

Добравшись до Киева, девушка поступила там работать в швейную мастерскую.

Настал 1874 год. В этом году разночинцы начали свое знаменитое хождение «в народ». Революционное движение широким потоком разлилось по всей России, и влияние его достигло даже уединенного жилища молоденькой швеи.

Она познакомилась с некоторыми из девушек, только что вернувшимися из Цюриха, фигурирующими впоследствии в знаменитом процессе 50-ти. Они-то и привлекли ее к движению. Впрочем, ее участие в нем было вначале очень скромным. Она дала свой адрес для революционной переписки. Когда, однако, ее «преступление» было открыто, ей пришлось поплатиться за него ни больше ни меньше двумя годами заключения в Литовском замке по приговору суда. Там, находясь вместе с четырьмя или пятью подругами, Геся впервые познакомилась как следует с принципами социализма и отдалась ему всем сердцем и душой. Но ей не скоро удалось начать применение новых идей к жизни, так как по отбытии наказания, вместо того чтобы выйти на свободу, она была сослана административным порядком в одну из северных губерний, где оставалась до осени 1879 года. Наконец, воспользовавшись какой-то беспечностью своих стражей, она сбежала оттуда и вскоре прибыла в Петербург. Здесь она с жаром бросилась в борьбу, сгорая жаждой дать полное удовлетворение той потребности работать для дела, которая у нее превратилась в страсть тем более жгучую, что пришлось долго сдерживать ее.

Всегда деятельная и неизменно веселая, она довольствовалась самым малым, лишь бы это было полезно для дела. Она охотно выполняла всякие роли: почтальона, рассыльного, часового, и часто

работа была настолько утомительной, что изнуряла силы даже этой здоровой девушки. Сколько раз бывало, она возвращалась домой поздно ночью, измученная до изнеможения после четырнадцати часов беспрерывной беготни по городу. Но на следующий день она поднималась снова бодрая и опять принималась за работу.

Она всегда была готова оказать услугу всякому, никогда не думала о себе. Чтобы дать понятие о нравственной силе и безграничной преданности этой простой, малообразованной женщины, достаточно припомнить последние месяцы ее революционной деятельности. Муж ее, Николай Колоткевич, один из известных и весьма уважаемых членов террористической партии, был арестован в феврале. Над его головой висел смертельный приговор. Но Геся продолжала оставаться в рядах борющихся, скрывая от всех свое страшное горе. Будучи уже на четвертом месяце беременности, она взяла на себя чрезвычайно опасную роль — хозяйки конспиративной квартиры, где изготовлялись бомбы Кибальчича, и пробыла там все время до дня своего вторичного ареста, который произошел в начале марта.

В день приговора она стояла веселая и улыбающаяся перед судьями, которые должны были послать ее на эшафот. Но ее судьба оказалась еще ужаснее: целых четыре месяца ей пришлось ждать казни! И эту нескончаемую нравственную пытку она выносила все время, ни на минуту не упавши духом, несмотря на усилия правительства, которое, побоявшись негодования Европы повешеньем беременной женщины (многие знаменитые люди того времени выступили на защиту Гельфман, в том числе и В. Гюго), старалось, по крайней мере, воспользоваться ее положением, чтобы исторгнуть какие-нибудь признания. Она тянула эту нравственную пытку до тех пор, пока сама жизнь Геси не оказалась в опасности, и только почти накануне родов ей было объявлено о замене смертной казни вечной каторгой.

Она умерла в тюрьме (находилась в Петропавловской крепости в Петербурге) вскоре после рождения ребенка (девочки), который был тотчас отнят у нее...

*Степняк-Кравчинский С. Собрание сочинений. М., 1987. Т. 1.*

## На зары рэвалюцыйнага руху

**Гартадзе Якаў Навумавіч** нарадзіўся ў 1894 г. на хут. Целяпуны (цяпер г. Мазыр) у сям'і рабочага фабрыкі «Прыма». З 1913 г. — член падпольнага прафсаюза ў Кіеве. Удзельнік Лютаўскай рэвалюцыі, грамадзянскай вайны на Мазыршчыне, арганізатар партызанскага руху. У 1919 г. — ваенком 2-га батальёна Мазырскага стралковага палка, у дні белапольскай акупацыі Мазыра — член падпольнага рэвалюцыйнага камітэта. У 1921—1923 гг. — начальнік павятовай міліцыі, памочнік упаўнаважанага Гомельскай губернскай ЧК, начальнік 2-га раёна Гомельскага губернскага крымінальнага вышуку.

Я. Н. Гартадзе



З 1923 г. — загадчык клуба мазырскай фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік», затым упаўнаважаны АДПУ. У 1933 г. быў неабгрунтавана рэпрэсіраваны, рэабілітаваны ў 1956 г.

### З успамінаў Я. Н. Гартадзе

...В 1904 году мне было 10 лет, и я хорошо помню революционные и предреволюционные события тех лет. Мозырь в дни революции играл большую роль в революционном движении всей Белоруссии. Я видел, как готовились к революции рабочие фабрики «Прима», как создавались отряды самообороны, проводились массовки в телепуновских оврагах и других местах. Я видел и близко знал социал-демократов, непосредственных участников революции Геннадия Горелика, Эстер Гурецкую, Алексея Дубовца, Наума Алштинс-Шапиро, Б. Сонина (по кличке Дробок), Евсея Кимбаровского, М. Лапущика, М. Шейнмана и других, имена которых стерлись в памяти.

В дни революции, когда колонны рабочих демонстрантов фабрики «Прима» направлялись в город, где смыкались с городским пролетариатом, с рабочими фабрики «Молния», мы, ребятишки, тоже бегали под ногами демонстрантов. Демонстрация направилась к тюрьме, чтобы освободить политзаключенных. Я слышал среди идущих: «Нужно скорее освободить Евсея Когана». Это был известный социал-демократ, искровец, пламенный оратор, пользующийся у трудовых мозырян всеобщим уважением.

Вдруг войска и жандармы открыли стрельбу по демонстрантам. Эти страшные минуты мне запомнились на всю жизнь. Были ранены И. Гурецкий, Е. Кимбаровский, Э. Гурецкая — ей потом ампутировали руку. Е. Г. Когана нашли в тюрьме с проломанным черепом. Так расправилась

царская охранка с мозырскими революционерами. Позже выяснилось, что в этом побоище и кровопролитии на стороне жандармов действовали и мозырские черносотенцы, прицельно стрелявшие в безоружных демонстрантов.

Затем последовали повальные обыски, облавы и аресты. Хорошо помню, когда арестовали моих соседей, телепунских крестьян Ивана Москаля, Тимофея Телепуна (по прозвищу Тимох Гандупа), Карла Петровского, Адама Остаповича, Алексея Дубовца (трое последних — рабочие фабрики). Всех отправили в ссылку. Эстер Гурецкую, несмотря на тяжелое ранение, схватили и запрятали в тюремную камеру.

## З ПАМЯТНАЙ КНІЖКІ МІНСКАЙ ГУБЕРНІ НА 1883 г. ВЫДАННЕ МІНСКАГА ГУБЕРНСКАГА СТАТЫСТЫЧНАГА КАМІТЭТА

**Волостные правления**

Мелешковичское — старшина — Михаил Тимощенко
писарь — Казимир Заславский
Слобода-Скрыгаловское — старшина — Семен Клименко
писарь — Ярослав Заславский
Михалковское — старшина — Аким Хвещенко
писарь — Иван Поповец

**Почетный мировой судья**

Учитель Мозырской прогимназии, колежский советник Александр Николаевич Флеров-Булгак.

**Народные училища**

Скрыгаловское — учительница Екатерина Гахович.
Слобода-Скрыгаловское — учитель Яков Трифонович Черник.
Михалковское — учительница Анна Павловна Адамацкая.
Мелешковичское — учительница Ольга Ануфриевна Савич.

**Приходские священники**

Мелешковичского — Павел Тилинский.
Скрыгаловского — Василий Завитневич.
Скрыгалово-Слободского — Антоний Чайковский.
Михалковского — вакантная.

*Ні ў адной з валасцей не было медыцынскіх устаноў і фельчараў.*

## ЗВЕСТКІ АБ НЕКАТОРЫХ ВАЛАСЦЯХ І НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАХ МАЗЫРШЧЫНЫ СА СТАТЫСТЫЧНАГА ЗБОРНІКА «ВОЛОСТИ И ВАЖНЕЙШИЕ СЕЛЕНИЯ ЕВРОПЕЙСКОЙ РОССИИ». ВЫПУСК V. СПб., 1886 г.

### ВОЛОСТИ:

| Волостей | Сельских общин | Селений | Дворов | населения | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | муж. | жен. |
| Слобода-Скрыгаловская | 22 | 36 | 681 | 4170 | 4300 |
| Мелешковичская | 7 | 11 | 226 | 1191 | 1310 |
| Михалковская | 13 | 30 | 517 | 2388 | 2442 |

### СЕЛЕНИЯ:

**Слобода-Скрыгаловская волость:**

Слобода-Скрыгаловская — дворов 47, жителей 498, от уездн. центра 18 верст, в селе волостное правление, церковь православная, школа.

Балажевичи — дворов 25, жителей 171, в селе церковь православная, пристань, водяная мельница.
Борисковичи — дворов 22, жителей 361, церковь православная.
Загорины — дворов 11, жителей 100, церковь православная.
Кастюковичи — дворов 27, жителей 261, церковь православная.
Прудок — дворов 32, жителей 250, церковь православная, две водяные мельницы.
Скрыгалов — дворов 57, жителей 495, церковь православная, еврейский молитвенный дом, школа, лавка.

**Мелешковичская волость:**

Мелешковичи — дворов 87, жителей 860, от уезд. центра 22 версты, в селе волостное правление, церковь православная, школа, спичечный завод.
Васьковка — дворов 12, жителей 123, православная церковь, водяная мельница.

**Михалковская волость:**

Михалки — дворов 21, жителей 168, от уездного центра 14,5 верст, в селениях Михалки и Писаровка: волостное правление, церковь православная, почта, школа, винокуренный завод, мельница водяная.
Гурины — дворов 12, жителей 122, церковь православная.
Мазуры — дворов 2, жителей 16, кожевенный завод, мельница водяная.

**Буйновичская волость:**

Махновичи — дворов 61, жителей 467, церковь православная.

**Наровлянская волость:**

Барбаров (Бабиче, Кожушки) — дворов 32, жителей 226, церковь православная.

## СПІС ЗЕМЛЕЎЛАДАЛЬНІКАЎ МАЗЫРШЧЫНЫ (У СУЧАСНЫХ МЕЖАХ) ЗА 1889 г.

| Владелец | Имение | Площадь (десятин) |
|---|---|---|
| 1. Березовский Константин Иванович, дворянин | Вел. Боков | 392 |
| 2. Беляева Татьяна Дмитриевна, жена надворного советника | Кимборовка | 117 |
| 3. Горват Александр Игнатьевич, дворянин | Барбаров | 10 562 |
| | Дудичи | 8970 |
| 4. Игнатьева Екатерина Леонидовна, графиня | Скрыгалов | 10 148 |
| | Мелешковичи | 18 419 |
| | Ремезы | 6797 |
| 5. Круковские: Константин, Сафроний и Петр Николаевичи | Малые Зимовищи | 916 |
| 6. Ленкевич Болеслав Иванович | Прудок и Хомички | 3006 |
| | Олгомель | 1918 |
| 7. Ленкевич Владислав Викентьевич, дворянин | Малый Боковец | 2100 |
| 8. Ленкевич Михаил Игнатьевич, дворянин | Михалки | 2000 |
| 9. Марцинкевич Варвара Ивановна | Вел. Боков | 770 |
| 10. Обухович Владислав Станиславович, дворянин | Седельники | 1778 |
| 11. Пиотрович Николай Яковлевич | Слободка | 142 |
| 12. Пржибора Северин Антонович, дворянин | Антоновка | 250 |
| 13. Родевич Михаил Васильевич | Митьки | 856 |
| 14. Римша Иосиф Викентьевич | Вел. Боков | 196 |
| 15. Римша Франц Викентьевич | Вел. Боков | 196 |
| 16. Снедецкий Казимир Осипович, дворянин | Слобода Скрыгаловская | 2584 |
| | Костюковичи | 2820 |

| Владелец | Имение | Площадь (десятин) |
|---|---|---|
| 17. Тишкевич Осип Демидович, граф | Осовец | 18 324 |
| | Лельчицы | 33 204 |
| | Острожанка | 33 030 |
| | Высокое | 9494 |
| 18. Фон-Бок Карл Берентович | Каменковская Рудня | 500 |
| 19. Яблонская Софья Григорьевна, дворянка | Митьки | 575 |
| 20. Шеппелер Карл-Генрих Егорович по купчей от 1879 г. стал владельцем имений | Скрыгалов | 15 155 |
| | Мелешковичи | 22 706 |

## З ДАКЛАДА МАЗЫРСКАЙ ПАВЯТОВАЙ ЗЕМСКАЙ УПРАВЫ ПАВЯТОВАМУ ЗЕМСКАМУ СХОДУ 13 СНЕЖНЯ 1911 г.

...Хлебопашество в Мозырском уезде ведется крестьянами на землях часто негодных, обычно же бедных органическими веществами. При таком характере почвы громадную роль играют вопросы сельскохозяйственной техники и количество удобрений. По отношению этого последнего крестьянское хозяйство обставлено самым невозможным образом. Не говоря уже о том, что крестьянский скот более пяти месяцев, нередко с середины апреля и обычно до октября, пасется или в обремененном пастбищным сервитутом лесу соседнего землевладельца, или, при отсутствии последнего, что встречается редко, в своем никуда не годном лесу, кормится он зимою плохо, а содержится еще хуже. Летом крестьяне гонят его 2—3, а то и 5—7 верст в один конец, что влияет на молочность коровы, вообще изнуряет скот. Зимою крестьяне кормят свой скот кислыми злаками и яровой соломой и содержат его в холодных хлевах со щелями в стенах и воротах, без окон, часто без потолка и с воротами, настолько плохо сделанными, что под ними свободно пролезает собака. Конечно, при таких условиях вся польза корма идет в значительном числе на развитие тепловой энергии, а не на образование молока. Скот при этом мелкий и худощавый. Между тем, для того, чтобы получить хороший навоз, нужен и другой скот и хороший корм...

...Пашут крестьяне обыкновенно негодным сельскохозяйственным орудием — сохой, хотя в последнее время кое-где уже появляется плуг. Механическая обработка почвы при этом недостаточно глубокая и небрежная. Бороны — деревянные, железных почти нет. Окучивание картофеля производится обычно ручным способом при помощи так называемых «копаниц», редко можно встретить обработку картофеля особым плугом — окучником. Канавы отсутствуют, но зато изобилуют межи, дороги и тропинки — превосходные рассадники трав. Посевной материал негодный, содержащий всегда в значительном количестве семена сорных трав. Не говоря о недоброкачественности зерна, ржаная солома тонкая и короткая, такой же и колос... Всматриваясь в современное положение скотоводства в крестьянском хозяйстве, ясно видно, что крестьяне держат коров исключительно ради приплода и как производителей навоза...

*Документы и материалы по истории Белоруссии. Мн., 1953. Т. 3.*

## З ПАМЯТНАЙ КНІЖКІ МІНСКАЙ ГУБЕРНІ НА 1914 г. ВЫДАННЕ МІНСКАЙ ГУБЕРНСКАЙ ДРУКАРНІ

**Мозырский уезд**

Уездный предводитель дворянства — коллежский асессор Александр Алексеевич Педреп.

Уездная земская управа — Александр Александрович Флеров-Булгак.

Земский врач скрыгаловского врачебного участка — Леонид Казимирович Чайковский.

**Одноклассные народные училища в 1914 г. и их учителя:**

Балажевичское — Анастасия Прикот; Березовское — Екатерина Ткач; Бибиковское — Михаил Секач, Людмила Жданевич; Васьковское — Дионисий Жогло; Глиницкое — Елена

Немкович; Казимировское – Степанида Олешка; Кустовницкое – Герасим Стахейко; Лешнянское – Лидия Билетова; Мало-Боковецкое – Александра Яковлева; Махновичское – Павел Рухло; Мелешковичское – Адам Дорошевич, Нина Прокопович; Прудковское – Гаврил Кошный, Михаил Кокоренко; Романовское – Григорий Маркуль; Слобода-Скрыгаловское – Петр Турко, Анна Слуцкая; Скрыгаловское – Константин Захарьяш, Василий Крокас.

### Працоўныя будні сялян

Сяляне на Мазыршчыне на працягу многіх стагоддзяў займаліся не толькі земляробствам, якое не магло ў поўнай меры забяспечыць іх сродкамі існавання. Значнай падмогай у гаспадарцы з'яўляліся шматлікія рамёствы і промыслы, вядомыя са старажытных часоў. Саматужным спосабам рабілі вазы, сані, дугі, колы, палатно, ганчарныя і бандарныя вырабы. Промыслы былі для сялян асноўнай справай, а таксама дадатковым заняткам у вольны час. Да адмены прыгоннага права ўмельцы, якія выраблялі для свайго памешчыка прадметы побыту, вызваляліся ад работ на паншчыне. Па даных «Агляду Мінскай губерні за 1903 г.» у Мазырскім павеце налічвалася 664 адзіночкі-саматужнікі, якія выраблялі прадукцыі на 64 420 рублёў у год. Аднак развіццё промыслаў ішло павольна – не хапала неабходных матэрыялаў, насельніцтва жыло бедна і поўнасцю залежала ад сваіх гаспадароў.

Найбольш распаўсюджанымі хатнімі промысламі было ткацтва, выраб пражы і нітак. Гэтыя заняткі з'яўляліся неад'емнай часткай натуральнай сялянскай гаспадаркі. Увесь працэс – ад сяўбы лёну да атрымання з яго гатовай прадукцыі кожная сям'я выконвала сваімі сіламі, але асноўныя работы – на полі, а потым і выраб пражы, нітак клаліся на жаночыя плечы. Амаль усё выконвалася ўручную. Ручнікі, посцілкі ткалі на кроснах. Няхітрыя прыстасаванні, зробленыя ў хатніх умовах – калаўроты, маталкі, верацёны – аблягчалі жаночую працу.

Да аднаго з найбольш старажытных рамёстваў, якія бытавалі на Мазыршчыне, адносіцца вытворчасць гліндага посуду. Ганчарныя вырабы можна было набыць на штогодніх кірмашах у Мазыры і Скрыгалаве. Тут сяляне куплялі збаны для малака і квасу, кубкі, гаршкі, а таксама посуд для захоўвання прадуктаў, зерня. У паўсядзённым побыце выкарыстоўваліся драўляныя вырабы – лыжкі, дзежкі, кадушкі, бочкі, вёдры, кублы, вырабы з лазы, бяросты і лыка, корабы, кошыкі, сумачкі і г. д. Не кожны гаспадар мог, напрыклад, пашыць кажух з аўчыны.

Важным промыслам былі паляванне і рыбалоўства – у Прыпяці і яе прытоках вадзілася шмат рыбы. У «Энциклопедическом словаре» (т. XIX), выдадзеным І. Ефронам у 1896 г., указвалася, што ў Прыпяці ловяцца асятры, у лясах Палесся водзяцца зайцы, лісіцы, мядзведзі, дзікі, ласі і інш. Паляванне на звяроў і птушак было даволі распаўсюджана, але пасля паўстання 1863 г. жыхарам было забаронена мець агнястрэльную зброю, што значна зменшыла аб'ём здабываемай прадукцыі. У 1903 г. на Мазыршчыне рыбалоўствам займалася 270 чалавек з агульнай гадавой выручкай да 11 770 рублёў. Многія паляўнічыя і рыбалоўныя прылады людзі рабілі самі – пасткі, сеткі і інш.

Пасля рэформы 1861 г. у выніку расслаення сялянства і малазямелля ва ўмовах недастатковага развіцця прамысловасці з'явіліся лішкі сельскага насельніцтва, пачалі пашырацца адходныя промыслы. Важнае значэнне мелі высечка і сплаў лесу, выганка смалы і дзёгцю, выпальванне вугалю, нарыхтоўка бяросты і г. д. У 1903 г. на Мазыршчыне гэтымі промысламі займаліся больш як 18 тысяч чалавек.

Галоўнай крыніцай даходаў памешчыка Горвата ў вёсцы Барбароў былі смалакурні. Мазырскія плытагоны гналі лес па Прыпяці і Дняпры ў Адэ-

су, Мікалаеў, Херсон і іншыя парты Чорнага мора — усяго на 3 млн. рублёў у год. Для адгрузкі лесу на Прыпяці было пабудавана да 10 прыстаней — каля вёсак Балажэвічы, Скрыгалаў, Касцюковічы, Загорыны, Лучажэвічы, Кімбараўка, Сідзельнікі, Барбароў і інш. Ад прыстані Балажэвічы праз вёскі Асавец, Крушнікі і далей на Махнавічы для вывазу лесу была пабудавана і дзейнічала некалькі дзесяцігоддзяў вузкакалейная чыгунка (конка).

Мазыршчына спрадвеку славілася сваімі ўмельцамі — будаўнікамі, цеслярамі, печнікамі, кавалямі. За межамі павета былі вядомы цесляры Слабада-Скрыгалаўскай воласці. Будавалі судны featureрознага водазмяшчэння — баркі, паўбаркі.

*М. Сузько*

### Загадка мядовага піва

У экспазіцыі Мазырскага філіяла краязнаўчага музея — музея дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, створанага народным мастаком жыхаром горада М. М. Пушкаром, выклікае цікавасць звычайная бутэлька з-пад піва. Высокая, у форме конуса, з зялёнага шкла. Надпіс на ёй сведчыць пра тое, што адліта бутэлька ў Мазыры. У такі посуд у пачатку XX ст. разлівалі піва гарадскога піваварнага завода — славутае мазырскае піва.

У пратаколе будаўнічага аддзялення Мінскага губернскага праўлення ад 12 студзеня 1885 г. гаворыцца аб дазволе купцу другой гільдзіі Майсею Шандрову-Аляксандраву наладзіць у двухпавярховым доме на Кіеўскай набярэжнай у прадмесці Мазыра Кімбараўцы піваварны завод. А піва варылі ў Мазыры адменнае — мядовае, сапраўдны цуд піваварнага майстэрства... Яно пастаўлялася да царскага стала і, як сведчыць легенда, было любімым напіткам Мікалая II.

Было чым ганарыцца мазыранам і І. Павіцкаму, уладальніку півамёдаварнага завода. Прадукцыя яго славілася на ўсю Расію, на этыкетцы быў намаляваны залаты медаль, якім было ўзнагароджана мазырскае піва на кірмашы ў Растове-на-Доне ў 1911 г.

У 1920 г. бандыты арміі Булак-Балаховіча расстралялі І. Павіцкага з сынам. Разам з ім зніклі рэцэпты славутага піва. Існуе версія, што ў архівах Петрадварца, магчыма, захаваўся старадаўні рэцэпт, і, такім чынам, ёсць надзея, што вернецца мядовае мазырскае піва...

*А. Адаська*

### Не зламалі ні турма, ні ссылка

**І. М. Палонскі,** член РСДРП з 1907 г., працаваў друкаром на мазырскай запалкавай фабрыцы «Маланка», з'яўляўся членам забастовачнага камітэта. За ўдзел у рабочым руху быў арыштаваны і пасаджаны ў мазырскую турму, потым сасланы на катаргу ў Сібір.

У савецкі час быў наркамам працы Крымскага Саўнаркама, генеральным прадстаўніком Дзяржгандлю СССР у Францыі, дырэктарам буйных прадпрыемстваў краіны.

### З успамінаў І. М. Палонскага

Рэвалюцыйнае ядро мазырскіх рабочых на пачатку XX ст. знаходзілася на запалкавай фабрыцы «Маланка», дзе я працаваў друкаром па вырабе этыкетак для запалкавых карабкоў. Пад кіраўніцтвам сацыял-дэмакратаў тут не раз праводзіліся забастоўкі рабочых, якія насілі не толькі эканамічны, але і палітычны характар. Людзі патрабавалі павышэння заработнай платы, палітычных свабод. Памятаю забастоўку ў канцы лістапада 1906 г., якая працягвалася цэлы месяц. Адміністрацыя фабрыкі не хацела ісці на ўступкі, але і мы не адступалі ад сваіх патрабаванняў.

У снежні забастовачны камітэт фабрыкі, членам якога я быў, сабраўся для абмеркавання становішча і распрацоўкі далейшых мер барацьбы. Ноч была месячная, хтосьці заўважыў наглядчыка. Мы зразумелі — за намі сочаць, але хавацца было ўжо позна. Уварвалася паліцыя. 18 членаў камітэта, у тым ліку і я, былі арыштаваны і адпраўлены ў мазырскую турму. А пасля — доўгая, цяжкая дарога ў Сібір на вечнае пасяленне з пазбаўленнем усіх правоў і маёмасці.

У ссылцы, у далёкай вёсцы Тасева Енісейскай

губерні, наша становішча было вельмі цяжкім, але мы ніколі не падалі духам. Там я пазнаёміўся са старымі бальшавікамі – М. М. Загуменнай, А. А. Чарапанавым, А. А. Садзінай-Чарнявінай і іншымі. Памятаю, як святкавалі 1 Мая 1910 г. З навакольных вёсак сабралася чалавек шэсцьдзесят паліткатаржан. На нагах яшчэ не зніклі сляды ад кайданоў, многія не змянілі арыштанцкіх бушлатаў. З чырвонымі сцягамі і рэвалюцыйнымі песнямі мы ішлі па вёсцы. Мясцовыя сяляне яшчэ не бачылі такога шэсця, арганізаванасці, не чулі нашых песень. Яны гаварылі: «Гэта харугва паліткатаржан». Дэманстрацыя зрабіла на ўсіх такое вялікае ўражанне, што жандары разгубіліся і не ведалі, што рабіць.

У 1912 г. я і ўральскі рабочы Рыгор Котаў рашылі ўцячы з ссылкі. Прабіраліся праз усю Расію – у Парыж, да Леніна. Ніколі не забуду сустрэч з Уладзімірам Ільічом і Надзеяй Крупскай. Я неаднаразова прысутнічаў на сходах парыжскай секцыі сацыял-дэмакратаў, на якіх абмяркоўваліся ўнутрыпартыйныя і міжнародныя пытанні.

Мая спецыяльнасць друкара вельмі спатрэбілася ў Парыжы. Я працаваў у друкарні, у якой выдаваўся цэнтральны орган партыі «Сацыял-дэмакрат». Ішоў час, у Расіі спела рэвалюцыя...

У верасні 1917 г. я вярнуўся з эміграцыі ў Расію. Хутка па мандаце Цэнтральнага камітэта партыі за подпісам Уладзімірскага і Нагіна быў накіраваны ў Крым для падпольнай работы і барацьбы за Савецкую ўладу.

...Лёс складваўся так, што на працягу амаль 60 гадоў мне не ўдавалася пабываць у Мазыры. І вось я ў горадзе майго юнацтва... Вельмі многіх баявых таварышаў ужо няма. Яны жылі, змагаліся, спадзяваліся. Цяжка сказаць, ці спраўдзіліся сёння іх спадзяванні... Добра хоць тое, што засталася пра іх памяць.

### З РАПАРТА МАЗЫРСКАГА ПАВЯТОВАГА СПРАЎНІКА МІНСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ

*29 ліпеня 1914 г.*

«...Инициаторами крестьянских выступлений являлись запасные, участвовавшие в русско-японской войне. Если в апреле и мае 1914 года произошло по одному выступлению крестьян в Мозырском уезде, то в июле их было уже 20. Многие участники этих выступлений были арестованы и 60 человек осуждены военно-полевым судом...»

*Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). Ф. 295. Воп. 1. Спр. 802.*

### ПАВЕДАМЛЕННЕ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ

*24 студзеня 1915 г.*

18 ноября 1914 г. Минским Военно-Окружным Судом присуждены к смертной казни через повешение крестьяне Николай и Ярослав Коханевичи, Патрикий и Ефим Скаковцы, Александр и Григорий Охремчуки, Семен и Дмитрий Колодичи, Тимофей, Михаил и Иван Кулакевичи, Федор Кибукевич и Иван Кравченя, обвиняемые в разбойном нападении на имение Великий Боков Мозырского уезда, помещицы Бржезовской.

Приговор этот утвержден генерал-адъютантом Ивановым лишь в отношении Николая Коханевича, Патрикия Скаковца и Александра Охремчука, а в отношении остальных осужденных смертная казнь заменена каторжными работами: Дмитрию и Семену Колодичам, Ивану Кравчене, Ярославу Коханевичу, Тимофею и Михаилу Кулакевичам, Федору Кибукевичу и Ивану Кулакевичу без срока каждому, а Ефиму Скаковцу и Григорию Охремчуку на двадцать лет каждому.

Приведение приговора над осужденными к смертной казни через повешение состоялось в ночь на 18 декабря 1914 г.

Губернатор, камергер Высочайшего Двора
Правитель канцелярии

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НА РБ). Ф. 295. Воп. 1. Спр. 8703. Л. 178.*

## Слаўныя імёны

**Васільева Анастасія Якаўлеўна** – беларускі этнограф, фальклярыст і краязнавец 2-й паловы XIX ст. Настаўнічала ў Пінску, Мазыры і іншых месцах беларускага Палесся, некаторы час працавала валасным пісарам у в. Грабаў (цяпер Петрыкаўскі р-н). Актыўна даследавала побыт, матэры-